УДК 741+378.147.025.7

# Выяўленчае мастацтва і яго роля ў адукацыйным і выхаваўчым працэсе

Барбарчык М.І.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Творы выяўленчага мастацтва трывала ўвайшлі як у грамадскае асяроддзе жыцця людзей, так і ў іх быт, упрыгожваючы фасады будынкаў, экстэр’еры паркаў і плошчаў, інтэр’еры палацаў і жылля. І гэта натуральна таму што ўдалая карціна альбо прыгожая скульптура здольныя зрабіць чалавека больш высакародным, прабудзіць светлыя пачуцці і думкі, сагрэць душу. Узгадваю, якое моцнае эмацыянальнае ўздзеянне на мяне ў паўночным і халодным Эрмітажы стварылі палотны вялікага Рэмбрандта. Карціны выпраменьвалі дзіўнае свячэнне, напаўняючы прастору навокал цяплом і сапраўдным жыццёвым сэнсам. Але выяўленчае мастацтва здольнае выконваць і іншыя функцыі, разам з тым і адукацыйныя, што непасрэдна звязана з мастацкай педагогікай.

У дыдактыцы і методыках выкладання мастацкіх дысцыплін назапашаны вядомы вучэбны матэрыял, які дазваляе педагогам вырашаць як задачы навучання, так і выхаваўчыя задачы, вырашэнне якіх звязана з выкананнем практычных заданняў, што в першую чаргу развівае ўменні. Уменне, як нам вядома, гэта асабліва каштоўны кампанент навучання, які дазваляе забяспечыць паспяховае дасягненне мэты ў розных сітуацыях з максімальна магчымай якасцю, што, несумненна, станоўча ўплывае на вынікі навучання і ў іншых галінах навукі.

Дасягненне мэты і варыянтнасць спосабаў яе выканання, характэрная для творчых дысцыплін, спрыяе фарміраванню сістэмы разумовых, сэнсарных, мнеманічных, валявых дзеянняў, якія развіваюць такія найбольш каштоўныя якасці асобы, як інтэлектуальнасць, эмацыянальнасць, чуласць, што, несумнена, абуджае ў вучняў творчы подыход да работы. Развіццё актыўнасці і пазнавальных здольнасцяў у працэсе пошукаў адказаў на ўзнікаючыя пытанні, рашэнне тых альбо іншых задач, вылучаемых у ходзе вучэбнага працэса, разумовае напружанне, пераадольванне цяжкасцяў дазваляюць творцам нарошчваць сілы, павышаць інтарэс да ведаў, што абуджае матывацыю і стварае станоўчы эмацыянальны настрой.

У працэсе авалодвання выяўленчым мастацтвам, яго ведамі і ўменнямі вучань авалодвае чалавечай культурай, а гэта, вядома, развівае яго асобу, мысленне, эмацыянальна-волевую сферу, мэтанакіраванасць, светапогляд, г. зн. здзяйсняецца выхаваўчая і развіваючая функцыя навучання.